КАЛЯДНЫ «КАРАГОД»

Калядныя абрады сустрэчы Старога Новага года прайшлі ў ваколіцах Лельчыцаў. У вёсцы Ліпляны асноўным удзельнікам калядавання быў дзіцячы гурт «Карагод». Не забываюць традыцыю і жыхары райцэнтра.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

СЁННЯ

Месяц

Поўня ў 7.52.
Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.19	17.20	8.01
Віцебск —	9.15	17.03	7.48
Магілёў —	9.09	17.10	8.01
Гомель —	8.58	17.14	8.16
Гродна —	9.33	17.37	8.04
Брэст —	9.26	17.45	8.19

Імяніны

Пр. *Малахіі, Гардзея.*
К. *Валерыі, Бярнарда, Вальдэмара, Уладзіміра.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



■ У часопіса — юбілей

НА ВЯСЁЛЫХ АРЭЯЛЯХ «КАЧЕЛЕЙ»

Упэўненае месца сярод айчынных дзіцячых перыядычных выданняў займае штомесячны часопіс «Качели». Мінула 15 гадоў з часу выпуску першага нумара. Раней галоўным рэдактарам часопіса працавала Кацярына Дубінская (зараз — генеральны дырэктар агенцтва «Минск-Новости»). Сёння часопіс рэдагуе Эмілія Луканская (некалькі дзесяцігоддзяў яна з'яўлялася галоўным рэдактарам газеты «Зорька»).

За сваю пятнаццацігадовую гісторыю часопіс зарэкамендаваў сябе сапраўдным сябрам беларускай дзіцячай літаратуры. На старонках «Качелей» — вершы, апавяданні, казкі, песні. Аўтарамі часопіса былі і застаюцца Анатоль Бутэвіч, Анатоль Зэкаў, Уладзімір Ягоўдзік, Алена Масла, Алесь Бадак, Валерый Кастручын... «Качели» шмат каму далі пуцёўку ў журналістыку, дапамаглі выбраць прафесію мастака.

Са святам, «Качели»! Са святам, аўтары і чытачы папулярнага ў школьнікаў краіны часопіса «Качели»!

Сяргей ТУРЫНСКІ

■ Факт

Елкі ў кадках набіраюць папулярнасць

Сёлета да навагодніх свят лясгасы краіны рэалізавалі 172 тысячы навагодніх дрэў.

Найбольшай папулярнасцю, па традыцыі, зноў карысталіся елкі. Хаця, адзначаюць у Міністэрстве лясной гаспадаркі, з кожным годам іх набываюць усё менш. А вось папулярнасць сасны расце. З агульнай колькасці навагодніх дрэў яе прададзена 17,1 тысячы штук. Найбольшым попытам сасна карысталася ў Віцебскай вобласці. Тут было набыта больш за 9,3 тысячы гэтых дрэў.

У міністэрстве, падводзячы своеасаблівыя вынікі «сезона», таксама адзначылі, што большым попытам сталі карыстацца дрэвы ў кадках і навагоднія букеты. Калі летась лясгасы прадалі толькі 130 елак у кадках, дык сёлета — ужо каля тысячы. Навагодняе дрэва ў кадцы зручнае тым, што яно захоўвае знешні выгляд і ў памяшканні, ігліца не асыпаецца. Дрэва патрабуе толькі паліву. А вясной яго можна высадзіць у грунт і яно будзе расці далей.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УСМІХНЕМСЯ

Самае карыснае, што я зрабіў на працы за апошні час — змазаў дзверы, каб не чуваць было, як я сыходжу на гадзіну раней.

— Кум, ці спадабаліся вашаму сыночку навагоднія падарункі?

— Вой... Разбіў ён усе падарункі! І машынку, і танк, і ўсе цацкі на ёлцы...

— І мой падарунак разбіў?

— Ды не, кум, ваш малаточак цэлы.

caricatura.ru

Даты | Падзеі | Людзі

1629 год — 385 гадоў з часу нараджэння (горад Полацк) Сімяона Полацкага (Самуіла Гаўрылавіча Пятроўскага-Сітніяновіча, па іншых звестках — Самуіла Емяльянавіча), беларускага паэта, драматурга, перакладчыка, выдаўца, рэлігійнага і грамадскага дзеяча. Каля 1650 года скончыў Кіева-Магілянскі калегіум, вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі. Акрамя роднай беларускай мовы, дасканала валодаў польскай і царкоўна-славянскай мовамі. Пісаў на гэтых мовах вершы, прамовы, навуковыя трактаты. З сярэдзіны 1650-х да 1664-га быў настаўнікам брацкай школы Полацкага Богаяўленскага манастыра. У 1656 годзе прыняў манаства пад імем Сімяон. Быў манахам ордэна базыльянаў. Прапагандаваў ідэю яднання хрысціян пад духоўнай эгідай рымскага папы і пад дзяржаўным патранатам маскоўскага цара. З 1664 года жыў у Маскве. Заснаваў незалежную ад патрыяршай цэнзуры Верхнюю друкарню, якая выпусціла 6 выданняў, пераважна творы самога Сімяона Полацкага або яго пераклады, у тым ліку «Букварь языка славенска». Быў першым прыдворным паэтам расійскіх цароў, выхавальнікам дзяцей цара Аляксея Міхайлавіча ад М.І. Міласлаўскай. Карыстаўся падтрымкай свайго вучня цара Фёдара Аляксеевіча. Быў у цэнтры дзяржаўнага і рэлігійнага жыцця Маскоўскай дзяржавы. Крытыкаваў стараверaў, падтрымліваў рэформы патрыярха Нікана. Пазней выступаў з асуджэннем Нікана на Вялікім саборы (1666-67). За 16 гадоў жыцця ў Маскве напісаў больш за 10 кніг і 200 пропаведзяў, якія былі выдадзены ўжо пасля яго смерці. Памёр у 1680 годзе.



1919 год — 95 гадоў таму нарадзіўся (горад Бабруйск) Уладзімір Уладзіміравіч Алоўнікаў, вядомы беларускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1957), народны артыст Беларусі (1970), прафесар (1980). У 1947-1994 гадах выкладаў у Беларускай акадэміі музыкі (Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі), у 1962-1982 гадах быў яе рэктар). Аўтар сімфанічных твораў «Партызанская быль», «Песні свету», «Партызанскія песні», «Нарач», камерна-інструментальнай і вакальнай музыкі, хораў, рамансаў, шырока вядомых песень «Радзіма мая дарагая», «Лясная песня», «Недзе ў пасёлку» і многіх іншых. Пісаў музыку для дзяцей, да спектакляў і кінафільмаў. Памёр у 1996 годзе.

1989 год — выйшаў указ аб рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. «Мы зыходзім з таго, што права жыць ва ўмовах міру і свабоды, — гэта галоўнае права чалавека». Гэтае выказванне Міхаіла Гарбачова азнаменавала пачатак новай эры ў гісторыі СССР. Важным яе складнікам стала рэабілітацыя ахвяр масавых рэпрэсій сталінскага перыяду. Толькі па афіцыйных звестках, ад рэпрэсій пацярпела 12,5 мільёна чалавек. Згодна з указам Вярхоўнага Савета СССР ад 16 студзеня 1989 года, нявінна асуджаным не толькі вярталася добрае імя. Тыя, хто выжыў, і сваякі загінулых атрымлівалі матэрыяльную і медыцынскую дапамогу.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:
«Нам трэба жыць і долю папраўляць,
Каб нас патомкі з часам не клялі».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 22.817. Індэкс 63850. Зак. № 252.

Нумар падпісаны ў 19.30 15 студзеня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12